№ 18 (3759)

5 сакавіка 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наступны нумар газеты «Народная Воля» выйдзе 7 сакавіка 2013 года.

ЗАПОМНИМ!

Александр ЛУКАШЕНКО:

Я требую прекратить вольницу в ценообразовании! ...За каждый процент роста вы ответите головой!

(Во время заседания правительства 01.03.2013 г.)

ПО ГОРЯЧИМ СЛЕДАМ

«Виноват Кириенко — в тюрьму его! Виноват Жилин — следом. Подчиненные — всех туда...»

Глава КГК **Александр Якобсон** в ходе пятничного заседания Совмина рассказал, что значительные государственные средства направляются крупными предприятиями, такими как "Беларуськалий", "Брестэнерго", "Гродноэнерго" и другими, на добровольное страхование дополнительной пенсии. **"Эти средства государственных предприятий перечисляются частной страховой компании "Белорусский народный страховой пенсионный фонд", которая размещает их на депозитах в банках, а получаемые от этого доходы используют в личных интересах акционеры этого общества (директор и ее муж, а также некоторые другие коммерческие структуры). Так, средняя зарплата директора в 2012 году составляла 30 миллионов рублей, а полученные дивиденды супругов за год составили почти 3 милларда рублей",** — отметил председатель КГК.

Далее о причинах сложившейся ситуации рассказывал министр финансов **Андрей Харковец.** По словам министра, в частности, "Беларуськалию" неоднократно предлагалось перейти на обслуживание государственным страховым предприятием, однако вопрос по ряду причин не решается.

Следующим был генеральный директор "Беларуськалия" **Валерий Кириенко,** который сослался на различного рода трудности. В свою очередь председатель концерна "Белнефтехим" **Игорь Жилин** вообще заявил, что *"эту тему узнал только сейчас".*

"Может быть, там Кириенко не на месте, если он элементарный вопрос не может решить? — отметил Лукашенко. — **Александр Серафимович** *(Якобсон),* **если вы не разберетесь, я разберусь с выводами для вас. Виноват Кириенко — в тюрьму его! Виноват Жилин — следом. Подчиненные — всех туда... Три миллиарда! Откуда эти деньги?! Они что, калийные удобрения производят и продают? Нет. И беспомощный Минфин!**

Возьмите на контроль, чтобы деньги эти, дивиденды, вложенные в особняки и прочее, были возвращены. Думаю, вы это решите в течение первого квартала. Вот, пожалуйста, эффективность работы КГК, Кириенко, Жилина, министра финансов и премьер-министра. Это и есть формальный бюрократический подход. Вам, Михаил Владимирович *(Мясникович),* **и Якобсону это просто пример вашего подхода к этому. Если вы не могли, снимите трубку, и к вечеру была бы резолюция президента, которую Валерий Вакульчик** *(председатель КГБ)* **с пулеметом бы выполнил или министр внутренних дел. На ваших глазах разворовывают деньги, а вы спокойно к этому относитесь.**

До конца марта все вопросы решить. Не решит, Кириенко — в камеру! А следом — министра!

Александр Серафимович, я последний раз вам делаю замечание. Или вы как председатель Комитета государственного контроля действуете так, как положено, защищая интересы государства, или придите и скажите: я боюсь, не могу.

Мне не очень удобно перед руководителями наших судов принимать тут решения, наверное, за них. Но вы видите бардак, дальше это просто нетерпимо. Пока мы дойдем до судов и прокуроры там все это оформят, вас завалят, и мы ничего не решим. С одной стороны, у них *(предприятий)* **денег нет, а с другой стороны — просто идет разбазаривание денег".**

ЗА ФАСАДОМ

«Все нормально, Ирина Борисовна работает, просто ее сейчас нет в офисе»

Белорусский народный страховой пенсионный фонд на рынке более 20 лет. Фонд был основан в 1992 году, специализируется на добровольном страховании жизни и дополнительной пенсии. К слову, среди учредителей и акционеров фонда не только частные лица, но также "Беларуськалий", заводы "Луч" и "Милавица", Белорусский союз предпринимателей, Республиканский комитет профсоюзов работников легкой промышленности и другие предприятия.

После скандального заседания, многие эпизоды которого транслировались на всю страну, сложилось впечатление, что директор фонда **Ирина Гузовская** и ее муж — председатель наблюдательного совета фонда **Игорь Ковалев**, не чисты на руку.

Мы решили спросить у них напрямую, что они думают по поводу угроз президента, что *"деньги эти, дивиденды, вложенные в особняки и прочее, будут возвращены".* И вообще, опасаются ли проверок, которые могут накрыть фонд, боятся ли возбуждения уголовного дела?

Но найти контакты руководителей Белорусского народного страхового пенсионного

фонда оказалось непросто. Сайт фонда в понедельник не работал. Грузилась только главная страница сайта, разделы "О фонде", "Контакты" и другие были заблокированы. Не прояснил ситуацию и визит в головной офис фонда, который находится в Минске на улице Пулихова.

На рабочем месте Ирины Борисовны Гузовской не оказалось. Работники фонда, услышав, что мы из газеты, тут же заявили: "Без комментариев". Мол, все, что было показано по телевизору, видели и слышали, но комментировать ничего не будут. Тем более зарплаты сотрудников. "Она по штатному расписанию", — единственное, что сказали сотрудницы и тут же спрятались за кодовой дверью офиса, открыть которую с улицы нельзя: вход только по звонку.

Немногословной была и секретарь директора Ольга. На все вопросы отвечала кратко:

— Все нормально. Ирина Борисовна работает, просто ее сейчас нет в офисе. В отпуск она не собирается.

Никто из представителей страхового бизнеса Беларуси тоже не согласился на открытые комментарии.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Ліміт на жыццё

Сталіца вызначылася з тым, якая колькасць высокатэхналагічных і складаных аперацый будзе аплачана за кошт бюджэту горада. У Мінску зацверджана Тэрытарыяльная праграма дзяржаўных гарантый па забеспячэнні насельніцтва медыцынскім абслугоўваннем у 2013 годзе.

Згодна з дакументам, аортакаранарнае шунціраванне за дзяржаўны кошт будзе зроблена ўсяго 200 пацыентам. 140 пацыентам — трансплантацыя ныркі, 35 — печані, 80 дарослым аплацяць аперацыю па перасадцы касцявога мозгу, 900 чалавек пройдуць эндапратэзіраванне буйных суставаў.

Такім чынам, упершыню афіцыйна ўзаконена чарга на аперацыі, якія ў многіх выпадках з'яўляюцца адзіным выратаваннем для пацыентаў. Раней такі "ліміт на жыццё" афіцыйна ніколі не ўводзіўся. Лічылася, што беларуская дзяржава здольна фінансаваць лячэнне людзей па патрэбе.

Больш за тое, дзяржава абяцала яшчэ да 2010 года ліквідаваць чаргу на правядзенне аперацый па аортакаранарным шунціраванні. Разлікі, праведзеныя згодна з патрабаваннямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, сведчаць, што кожны год у нашай краіне ёсць патрэба каля 4,5 тысячы аперацый аортакаранарнага шунціравання. Калі ўзгадаць, што кожны чацвёрты беларус жыве менавіта ў Мінску, то атрымліваецца, што сталічным жыхарам штогод патрабуецца не менш за тысячу такіх аперацый. А ў бюджэце закладзена толькі 200...

Аналагічная сітуацыя, падобна, і з тымі, хто чакае аперацыі па трансплантацыі органаў.

Ірына МАЛЬЦАВА.

Вясна затрымліваецца

У бліжэйшыя дні надвор'е будзе вызначаць антыцыклон з цэнтрам над Украінай, чакаецца сонечнае і спакойнае надвор'е.

У сераду — без ападкаў, на асобных участках дарог галалёдзіца, тэмпература паветра мінус 1—7°С, месцамі да мінус 10°С.

Днём плюс 1—7°С, па захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей плюс 8—10°С.

У чацвер пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах на поўдні краіны кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі на дарогах захаваецца галалёдзіца, тэмпература паветра мінус 1—7°С, днём 0°С — плюс 6°С. Па паўднёвым захадзе ноччу 0 — плюс 3°С, днём плюс 7—10°С.

ЖИЗНЬ ГЛУБИНКИ

Сергей НЕРОВНЫЙ

Тьма в конце тоннеля

Только и слышно о повышении тарифов на электроэнергию. Но разве цены выросли только на нее? Да и не только ценами определяется комфортность человеческого бытия.

Давно ловлю себя на мысли, что мы вступили на путь медленной деградации во всех сферах жизни. Процесс запущен и его не останавливает ни рост среднестатистических зарплат, ни разговоры о модернизации и реформе избирательной системы, ни показная борьба с коррупцией. Речи главы государства напоминают заезженную пластинку из римейка "старые песни о главном". На местах — та же "музыка" с региональным акцентом.

Политика "чарки и шкварки" привела к тому, что общество все больше погружается в смрадный туман из винных паров. В последнее время на улицах города нетрезвая и обкуренная публика попадается столь часто, что впору задуматься: а куда мы с вами пришли?

Корреспондент Д.Владимиров из райисполкомовской "Кричевской жизни", говоря о демографической ситуации в районе, придумал шедевральный заголовок — "В городе родилось больше". Это единственное "достижение" в области деторождения, как вы понимаете, высосано из пальца: город по определению должен "рожать" больше деревни ввиду численного превосходства над последней. Но даже из этой заметки с пропагандистским названием мы узнаем, что население Кричевщины стабильно сокращается: в январе в мир иной ушли 67 жителей, а число родившихся составило 27. Внешнее наблюдение подтверждает статистику из загса: увидеть счастливую беременную женщину на наших улицах приходится все реже.

Д.Владимиров сообщил также, что за январь этого года заключено 18 браков, что на 5 больше, чем за аналогичный период прошлого. А вот про общее количество разводов он решил не говорить, отметив только их упрощенную процедуру. Хотя всем известно о том, что каждый второй брак в Беларуси распадается.

"Мудрая" З.Вигуро решила "дать бой" вандалам, ломающим заборы, автовладельцам, прокладывающим неправильные "трассы", и "пачкунам" стен. В конце статьи ветеран предложила начать "путь к лучшей жизни" с себя.

Вот и я за то. Давайте начнем честно считать голоса на выборах, чтобы депутаты у нас выбирались, а не назначались сверху, давайте решим вопрос об официальной регистрации "Вольнага горада", давайте добьемся избрания мэра города населением, давайте местное самоуправление выведем из "вертикального" управления. Прежде чем обвинять людей в некультурном поведении, власть предержащие должны показать свое "моральное превосходство". Почему З.Вигуро молчала, когда в угоду личным интересам верхушки банкротились и закрывались предприятия, заводами руководили, не выпуская из рук стакана, когда отдельные члены исполкома в своем поведении забывали о стыде и совести. Неужели люди об этом не знали? Знали все, кроме З.Вигуро. Ей легче "наехать" на абстрактных "вандалов", чем затронуть "загнивающий муравейник" власти.

Председатель исполкома В.Сысоев официально признал, что итоги работы за январь его не радуют. Судя по всему, в облисполкоме накопилось много вопросов и к самому В.Сысоеву. Не помогают и явно заказные статьи в ряде областных и республиканских газет. В чем же дело? Подводят "золотые" кричевляне? Виноваты кадры? Не хватает потенциала самому рукводителю? Или все-таки виновата Система власти, при которой невозможно увидеть "свет в конце тоннеля". Только тьму.

"Кричевская жизнь" не желает признавать и обсуждать ситуацию, в которой оказалась Беларусь. Здесь "плавают по верхам", ведомые указивками идеологического отдела. По всей видимости, многие прежние "бойцы невидимого фронта" почувствовали, что дело (прежде всего в экономике) "пахнет керосином" и перестали писать о "происках дяди Сэма". Дабы не быть осмеянными читателями. З.Вигуро — одна из немногих, которая еще видит свет в конце тоннеля. Но он — от фар приближающегося поезда.

г.Кричев.

МЫ ПІСАЛІ...

Праверыць!

У адным з мінулых нумароў "Народнай Волі" быў надрукаваны матэрыял "Лукавые цифры", у якім мы пераканаўча даказвалі, што кошт жыллёва-камунальных паслуг у Беларусі аказаўся вышэйшым, чым у Еўропе, хаця ніякіх аб'ектыўных падстаў для гэтага няма. Матэрыял не застаўся без увагі.

Аляксандр Лукашэнка даручыў Камітэту дзяржаўнага кантролю разабрацца з тым, як адбываецца фарміраванне кошту жыллёва-камунальных паслуг і праверыць, ці апраўданы такія тарыфы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, раней ён ужо неаднаразова даваў такія даручэнні, аднак канкрэтных вынікаў няма да гэтага часу. *"Мы ўвесь час, абражаючы насельніцтва, кажам, што яны не плацяць. Прайдзіце ад пачатку да канца, пралічыце, колькі будзе каштаваць кожная паслуга",* — запатрабаваў ён. *"Простая безгаспадарчасць павялічвае сабекошт іх паслуг і тавараў, а мы гэта ўсё праглынаем",* — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

ПАДКАЗКА

Які падарунак зрабіць любімай жанчыне?

Не ламіце галаву! Букет кветак, а ў ім падпіска на "Народную Волю" —- і ўдзячнасць на бліжэйшыя месяцы забяспечана.

З'яўленне кожнага нумара "Народнай Волі" будзе заўжды нагадваць пра Ваш арыгінальны падарунак.

А мы пастараемся публікаваць такія матэрыялы, якія задаволяць густ любой жанчыны.

Ф. РП-1

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь

АБОНЕМЕНТ на газету **63 222** (индекс издания)

Народная Воля (наименование издания) | Количество комплектов

на 2013 год по месяцам

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Кому ______ (фамилия, имя, отчество)

Куда ______ (почтовый индекс) (адрес) (город, населенный пункт)

ДОСТАВОЧНАЯ КАРТОЧКА

на газету **63 222** (индекс издания)

Народная Воля (наименование издания)

Стоимость	подписки	руб.	Количество комплектов
	переадресовки	руб.	

на 2013 год по месяцам

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Кому ______ (фамилия, инициалы)

Куда ______ (почтовый индекс) (адрес) (город, населенный пункт)

ЧИСТОСЕРДЕЧНОЕ ПРИЗНАНИЕ

«Вся ваша болтовня вокруг прямых иностранных инвестиций дала результат в 2012 году лишь на 1,4 миллиарда долларов, что на 65% меньше, чем в 2011 году»

— Нельзя признать удовлетворительной работу правительства и местных органов власти по осуществлению инвестиционных проектов, реализуемых в нашей стране. В 2012 году предусматривалось завершить выполнение 76 проектов, включенных в республиканский перечень. Причем ни по количеству проектов, ни по срокам никто правительство в спину не толкал. Сами так решили, назначили ответственных. И вот результат. К началу этого года не реализовано 37 проектов — половина. За инвестиционную сферу деятельности в правительстве отвечает министр экономики. Но похоже, что увлечения либеральными рассуждениями и рыночными теориями и постоянные оглядки на зарубежных экспертов мешают вам, Николай Геннадьевич, и вашим коллегам, работающим в подобном стиле, эффективно заниматься вопросами инвестиций и другими очень серьезными вопросами, стоящими перед страной. Нет глубокого анализа и деловых предложений. Мы который год подряд снижаем объемы инвестиций в основной капитал. Причем в большей степени за счет сокращения объемов инвестирования в активную часть основных средств. В обновление активной части основных средств (машин, оборудования, транспортных средств) в 2012 году вложено лишь 42% общего объема капитальных вложений против 46% в 2011 году. А надо, чтобы было не менее 50%. Снижение происходит на фоне стенаний на всех уровнях о нехватке кредитных ресурсов. Возникает вопрос: а зачем давать эти ресурсы, если они используются нерационально?

В этой связи хочу упрекнуть всех министров и губернаторов: ваша работа по привлечению зарубежных капиталовложений практически не видна. Вся ваша болтовня вокруг прямых иностранных инвестиций дала результат в 2012 году лишь на 1,4 миллиарда долларов, что на 65% меньше, чем в 2011 году. И то почти все пошло в непроизводственную сферу — торговлю и финансовый сектор. Здесь министрам и губернаторам не нужно даже и напрягаться. Сюда инвестиции могут прийти и без вашего участия, — *сказал на заседании правительства Александр Лукашенко.*

БЛИЦ

На минувшей неделе глава государства устроил большой разнос правительству. Досталось многим. Так, премьер-министра ***Михаила Мясниковича*** *упрекнули в том, что он занимает “роль стороннего наблюдателя” — не вмешивается в конфликты, которые возникают между его подчиненными. И это, кстати, еще не самое критическое замечание в адрес премьера.*

Первого вице-премьера ***Владимира Семашко*** *обвинили в том, что он в своей работе исходит из “личных симпатий”, не считается “с мнением своих коллег”, проявляет “откровенную грубость, порой, несдержанность” и конфликтует с людьми, которые “назначены президентом”.*

Отреагировал А.Лукашенко и на многочисленные высказывания вице-премьера ***Анатолия Тозика****, от которых, по его словам, “будоражит всю страну”.*

Немало нелестных слов получили в свой адрес и другие персоны.

Интересно, хоть один чиновник после такой жесткой критики в свой адрес уйдет в отставку по собственному желанию или все, как ни в чем не бывало, будут работать дальше?

“Народная Воля” поинтересовалась, что думают об этом не только бывшие чиновники.

Хоть один чиновник уйдет в отставку?

Александр ГРИГОРОВ, экс-министр спорта:

— Я думаю, что нет. Никто в отставку не уйдет, все будут работать. В адрес спорта я там ничего не услышал, а если в целом говорить, то, знаете, есть такая поговорка: на то и щука, чтобы карась не дремал! Людям свойственно расслабляться, и кто-то должен их стимулировать, подстегивать, направлять...

Марат АФАНАСЬЕВ, экс-председатель Жлобинского горисполкома, экономист:

— Думаю, что нет. Среди членов правительства есть разумные люди, но все они связаны стадным инстинктом, ведь критиковали не кого-то одного, а многих. И, на мой взгляд, некоторые получили по заслугам.

Я заметил, что отдельные чиновники пытались отстаивать свое мнение — например, тот же председатель Миноблисполкома Борис Батура. Но ему просто терять нечего. А другим — есть. Поэтому и молчат. Мне кажется, у многих не хватит смелости просто подать в отставку. Если кто-то отважится, то один-два, не больше...

Анатолий ЛЕБЕДЬКО, лидер Объединенной гражданской партии:

— На моей памяти последняя отставка в знак несогласия с проводимой политикой была в 1996 году, когда правительственной дверью хлопнули тогдашний премьер-министр Михаил Чигирь и министр труда Александр Соснов. Считаю, это правильная позиция: не вписываешься в президентскую политику — уходи.

Мы знаем немало примеров, когда чиновников выбрасывали пинком под зад, сопровождая процесс публичным унижением. Кого-то потом, кстати, возвращали, как того же генерала Леонида Мальцева, например.

Думаю, чиновники сейчас находятся в такой ситуации, что сами никуда не уйдут. Будут терпеть, даже если о них, как о половую тряпку, будут каждый день вытирать ноги. Потому что таковы правила игры. К тому же сейчас, как было заявлено, начнут перепроверять, где работают уволенные чиновники. И если они на новой работе могут позволить себе есть хлеб с маслом, то это тоже станет предметом какого-то повышенного внимания или разбирательства.

Чиновников сегодня обложили красными флажками. Поскольку политического харакири у нас нет, они могут либо эмигрировать, либо идти работать в какой-нибудь захудалый колхоз. Им некуда бежать. Остается только делать либо организовывать какое-то внутреннее сопротивление, номенклатурный переворот, либо переходить к тихому саботажу власти. Еще вариант — идти в оппозицию...

Ирина МОРОЗОВА, домохозяйка:

— Было бы неплохо, если бы те, кто получил свою “порцию счастья” на том совещании, написали заявление об уходе. Или переводе на другую, менее ответственную работу. Мне кажется, так должен поступить любой, кто считает себя профессионалом, у кого осталась хоть капля собственного достоинства. А вот примут эту отставку или нет — это уже другой вопрос...

Игорь БАСЛЫК, экс-депутат Палаты представителей, бизнесмен:

— Думаю, что никто добровольно заявление об отставке не напишет. Почему? Все банально: народ запуган, а чиновники — тоже люди. И мы можем только догадываться, что у них творится в душе после таких совещаний, но, к сожалению, факт остается фактом: на какие-то реальные действия они сегодня не готовы. Чиновники не уходят в отставку не потому, что им очень комфортно в своих креслах, а потому что боятся. Страх — очень сильное чувство...

Оксана КУЛИК, менеджер:

— Мне кажется, ошибки делают все. Конечно, неприятно, когда на всю страну заявляют, что ты плохо справляешься со своими обязанностями. Но с другой стороны, руководить и управлять — это не такая простая работа. И хорошо, если этот разговор станет каким-то стимулом. Кто-то, возможно, задумается о другой работе или о том, чтобы уйти на пенсию. А кто-то, наоборот, будет стремиться сделать невозможное и показать результат. Кто как поступит — зависит прежде всего от характера.

Станислав БОГДАНКЕВИЧ, профессор, экс-глава Нацбанка:

— Я помню, и 15 лет назад Лукашенко такие же разносы устраивал — ничего нового в этом нет. Просто у него такой стиль руководства. И в те времена мало кто уходил после жесточайшей критики. И сегодня не уйдут. Будут сидеть до самого конца. Потому что по натуре чиновники такие же, как он...

Василий ШЛЫНДИКОВ, экс-глава концерна “Амкодор”:

— Думаю, нет — самостоятельных отставок не случится. Из-за страха. Чиновникам на этот раз обрисовали довольно ясную перспективу: если пойдут в коммерческую структуру, то этой организации в считанные дни может и не быть. Ясно, что коммерческие структуры теперь побоятся брать на работу бывших высокопоставленных чиновников — зачем попу такая гармонь? Поэтому ничего не сделаешь — нужно сжать зубы и тянуть этот непосильный груз...

Юрий ЗИССЕР, бизнесмен, создатель портала TUT.by:

— Я думаю, что у нас в государстве просто нет такой традиции. И я не помню случая, чтобы кто-то после подобных разносов сам ушел в отставку.

Не исключено, что кто-то из чиновников и не согласен с прозвучавшей критикой — такое тоже может быть. Что-то могло остаться за кадром, народу продемонстрировали самые яркие, эмоциональные моменты. Но одно дело игра на публику и совершенно другое — что на самом деле думает президент о том или ином чиновнике. А критиковать можно всегда. И любого руководителя всегда найдется за что...

Марина КОКТЫШ.

НА ЎЛАСНЫЯ ВОЧЫ

На папялішчы...

Рэпарцёр “Народнай Волі” паспрабавала дабрацца да месца, дзе яшчэ зусім нядаўна знаходзілася вёска Паўловічы, якую спалілі, каб вызваліць месца для будаўніцтва завода.

У снежні 2012 года відэа, на якім бачна, як палаюць яшчэ не пакінутыя людзьмі дамы і КАМАЗамі раўняюць падворкі, шакіравала Беларусь. Рэзананс быў надзвычайным — людзі так і не зразумелі, што ж стала нагодай для такога раптоўнага і жорсткага зносу. Тады самай верагоднай і абгрунтаванай падавалася тэорыя аб свавольстве віцебскіх уладаў. Маўляў, напярэдадні візіту Аляксандра Лукашэнкі ў горад вырашылі акультурыць пейзаж уздоўж Бешанковіцкай шашы. Калі журналісты пачалі разбірацца, высветлілася, што дамы мусілі пайсці пад знос яшчэ ў 1992 годзе, а на месцы хацелі збудаваць новую ЦЭЦ. Урэшце ад гэтай ідэі адмовіліся і зямлю перадалі на баланс гораду, а той выдзеліў тэрыторыю пад забудову скураапрацоўчаму заводу кампаніі “Марко”.

Прайшло тры месяцы. Мы вырашылі паглядзець, што адбываецца на ўскрайку Віцебска зараз.

Вёска Паўловічы стаяла на самым выездзе з горада. З суседзяў — мясакамбінат, малаказавод і “Віцебскэнерга”, якому паселішча раней і належала. Наўкола — толькі снежная цаліна, а воддаль на пагорку стаяць дачныя домікі. Вольнага месца тут столькі, што, падаецца, хоць дзесяць заводаў пабудаваць можна. Пейзаж навявае і іншую думку: як, цікава, пачуваліся дачнікі, калі бачылі, што да іх суседзяў пусцілі чырвонага пеўня? Адлегласць невялікая — маглі і пераблытаць...

Ні з шашы, ні ад прахадной “Віцебскэнерга” ніякіх зрухаў на тэрыторыі былых Паўловічаў не відаць. Заўважаны толькі лініі электраперадачы. Ні будоўлі, ні нават агароджы. Трэба наблізіцца да месца “ч”, можа, там хоць адзнака якая, што вось-вось распачнецца будаўніцтва? Альбо ўжо вывешаны пашпарт будучага аб’екта?

Дарогі да Паўловічаў няма. На вока разам з фатографам выбіраем самы прамы шлях, які гіпатэтычна прывядзе да былой вёскі. Навокал — бялюсенька, на снезе толькі птушыныя сляды і... кроплі крыві. Спачатку ажно ў пот кінула, але потым дайшло — мясакамбінат побач, птушкі нясуць адтуль той-сёй пачастунак. Далей сустракаюцца прысыпаныя снегам абгрызеныя косткі. Жудасна...

Так дагарала вёска...

…Снежная пустэча на месцы вёскі.

Ісці па цаліне цяжка і небяспечна — снегу за зіму насыпала шмат, ён схаваў і невялічкія яры, і бетонныя парэшткі незразумелых ці то недаўзведзеных, ці то разбураных будынкаў. Выпадкова натыкаемся на чалавечыя сляды, а потым і на самога “рабінзона”. Мясцовы жыхар збірае драўляны лом і галлё ў яры. Кажа, што, як і мы, дайшоў сюды ад дарогі.

“Да вёскі спаленай тут не пройдзеце, — катэгарычна руйнуе нашы надзеі выпадковы праваднік. — *Напэўна, да вясны туды ўвогуле не патрапіць, бо снегу шмат. Ніхто ж больш не ходзіць, не чысціць”*.

А як жа будаўнічая тэхніка, што будзе ўзводзіць завод? Мясцовы здзіўляецца. Аказваецца, ніхто тут і не чуў, што на месцы Паўловічаў будзе адбудавана сучаснае прадпрыемства.

“Калі тут будаваць нешта збіраюцца, то толькі летам, — канстатуе суразмоўца. — *Наўрад ці цяжкая тэхніка вясной пройдзе...”*.

Развітваемся з мясцовым і вяртаемся па ўласных слядах да асфальтаванай дарогі. Патрапіць у вогненную вёску так і не атрымалася і, па словах суразмоўцы, наўрад ці да знікнення снегу.

Пра ўсё гэта мы, выпадковыя па сутнасці людзі з іншага горада, даведаліся менш чым за дзве гадзіны. Няўжо той, хто аддаваў загад аб гвалтоўным зносе паселішча, гэтага не ведаў? Няўжо не было зразумела, што будаўніцтва, нават калі яно і вельмі патрэбнае, не пачнецца раней вясны? Дык чаму ў такім выпадку не далі жыхарам Паўловічаў сабрацца па-людску, нармальна вывезці рэчы, развітацца з родным месцам? Элементарная чуласць і павага не ўваходзяць у спіс рыс віцебскіх чыноўнікаў?

Марыя МАЛЕВІЧ.
Фота Сяргея ГРАБОЎСКАГА.

ЧУЛІ?

Адбіраць жыллё не будуць

Урад рыхтуе папраўкі ў прэзідэнцкі ўказ №13, які тычыцца льготнага крэдытавання пры будаўніцтве жылля.

Вядома, што яшчэ ў мінулым годзе ўлады абвясцілі, што будуць весці барацьбу з тымі, хто з дзяржпадтрымкай пабудаваў кватэру і адразу ж здаў яе ўнаём. Гразіліся нават кватэры гэтыя адбіраць, хаця па законе права такога няма. Але, відаць, урад прыдумаў іншыя механізмы, як рэгуляваць гэтую сферу.

— Мы зараз шукаем варыянт, як пабудаванае жыллё з дзяржпадтрымкай накіраваць па прызначэнні, гэта значыць для тых грамадзян, якія будавалі яго менавіта для пражывання. А калі грамадзяне здаюць гэта жыллё ўнаём і пры гэтым маюць другое жыллё, то яны будуць альбо плаціць падаткі, альбо будуць вымушаны вярнуць ільготныя крэдыты. Гэтае пытанне да канца яшчэ не вырашана, — заявіў днямі віцэ-прэм’ер Анатолій Калінін.

Напэўна, ні адзін з гэтых варыянтаў не палохае так, як пагроза пазбавіцца кватэры. Але ж невядома, які памер падатку будзе вызначаны, ды і не зразумела, што значыць вярнуць ільготныя крэдыты? Ці не азначае гэта, што выдадзеныя крэдыты пералічаць па стаўках, якія вызначаны пры набыцці звычайнага крэдыту на будаўніцтва жылля і заставяць розніцу вярнуць? Як кажуць, пажывём — пабачым.

ДАРЭЧЫ

З кватэры могуць выселіць яе ўладальніка

У Беларусі ўступіў у сілу Жыллёвы кодэкс і цяпер уласнікаў, якія запазычыліся па камунальных плацяжах, змогуць высяляць з кватэр.

Праўда, разлічыцца з камунальнікамі ім дазволяць. І калі паспеюць пакрыць пазыку, кватэры не пазбавяцца. Згодна з новым кодэксам, даўжніку, які мае 6-месячную запазычанасць, будзе прадастаўлена магчымасць на працягу года самастойна расплаціцца па пазыках або прадаць жыллё. Калі гэта не дапаможа, яго прыцягнуць да суда. І ўжо па рашэнні суда кватэра злоснага неплацельшчыка з ліку ўласнікаў можа быць выстаўлена на публічныя таргі. З атрыманай ад продажу сумы аднімуць суму запазычанасці за жыллёва-камунальныя паслугі, а за тыя грошы, што засталіся, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган набудзе і перадасць былому ўладальніку ва ўласнасць іншае жыллё. Яно будзе меншай плошчы, можа саступаць папярэдняму па сваіх спажывецкіх якасцях і пры гэтым размяшчацца, напрыклад, не ў Мінску , а ў іншым населеным пункце.

Як вядома, паводле ранейшага Жыллёвага кодэкса толькі наймальнікаў, якія пражываюць у дзяржаўных кватэрах, у судовым парадку перасялялі ў жыллё меншай плошчы за доўгатэрміновую запазычанасць па аплаце ЖКП.

Дарэчы, у Мінску па стане на 1 лютага бягучага года 14.663 уласнікі кватэр мелі запазычанасць па камунальных плацяжах на суму 3 млрд 885 млн рублёў (таксама 6032 наймальнікі — на суму 2 млрд 106 млн рублёў). З іх 377 уладальнікаў ухіляліся ад аплаты больш за 6 месяцаў, іх агульная пазыка складала 519 млн рублёў (сярод наймальнікаў такая запазычанасць лічылася паводле 305 асабовых рахункаў на суму 736 млн рублёў).

Ігар ЗАЛЕСКІ.

РЭГІЁНЫ

Увага! Паводка!

У Брэсцкай вобласці сочаць за ўзроўнем вады — надзвычайнай паводкі не чакаюць, але пільная ўвага ніколі не зашкодзіць.

Рака Гарынь у Столінскім раёне ўжо выйшла з берагоў. Прадстаўнікі МНС зазначаюць, што яна тут падбіраецца да небяспечна высокіх адзнак. Між тым пакуль прычын для панікі няма — надвор’е спрыяе людзям. Вада перастала прыбываць і нават патроху адыходзіць.

На жаль, яшчэ існуе верагоднасць моцнай паводкі. Калі рэзка пацяплее, празмернага разліву рэк не пазбегнуць.

У бабруйскіх школах з’явяцца інтэрнэт-дзённікі

Сэнс эксперымента ў тым, каб праз сусветнае сеціва трымаць цесную сувязь з бацькамі вучняў.

Планы, звязаныя з новай формай зносін паміж школай і бацькамі, проста напалеонаўскія. Мяркуецца, што бацькі будуць пакідаць свае парады настаўнікам і адміністрацыі, абменьвацца SMS-паведамленнямі з класнымі кіраўнікамі і гэтак далей.

Цікава, але за карыстанне электронным дзённікам бацькам прыйдзецца плаціць. Не так і шмат — каля 20 тысяч рублёў у месяц, але на што яны пойдуць?..

Марыя МАЛЕВІЧ.

ДИСКУССИЯ

У сильного всегда бессильный виноват

Публикация в минувшем номере Ивана Анташкевича о возможности диалога власти и оппозиции вызвала дискуссию на нашем сайте. С резкой критикой, например, выступил читатель ***Валер ГОЛУБ:***

— Что мешало и мешает ныне и Левковичу, и Оргишу организовать самим тот диалог, который здесь проповедуется? Ведь вы то годами корчили из себя вроде бы какую-то конструктивную оппозицию. Сами хотя бы разыграйте такой диалог с властью без так называемых радикалов: без Лебедько, без Статкевича, без Римашевского и т.д.

Где это он (имеется в виду Анташкевич. — **Ред.**) или они нашли у лиц какую-то животную агрессивность, якобы радикализм? Какой же бред несет этот Иван Анташкевич! Очухаться бы ему, ведь слово *отморозки* вертится не на языке оппозиционеров, а на языке Лукашенко. Ведь Некляев не ругался матом и никого не избивал, даже ни до кого-то не дотронулся, а этот Иван шьет ему радикализм между строк, а не жандармам от власти.

С дуба свалился, что ли?

И еще. У автора высказанных советов в голове винегрет из них. Кто-то с животной агрессивностью бьет людей, в том числе и руководителей партий, по голове, а он эту или иную животную агрессивность приписывает этим жертвам. С Луны свалился, что ли?

Автору нравится идея некоего философа Левковича и некоего философа Оргиша о четырех “К” — конструктивизм, компромисс, консенсус, консолидация. Идея, которая уже однажды проталкивалась и Левковичем, и Оргишем на страницах казенной газеты “СБ”. Кому? Только оппозиции? По логике понятий и вещей, не только ей. Кто же ее сорвал, отверг? Режим. Ибо он скандальный, и ему эти четыре “К” как кость в горле, мешающая горлу скандалить и скандалить.

Склонен считать публикацию автора провокационной, направленной на бесполезную трату энергии оппозицией в пустоту. Исходя из печальной судьбы прошлых попыток наведения мостов... между берегами режима и оппозиции. Если бы у главы режима было хоть минимальное прилежание к четырем “К”, он не разгонял бы Верховный Совет. Если бы у главы режима было хоть минимальное прилежание к четырем “К”, он не измышлял бы для оппозиции ярлык *пятая колонна.* И так далее. У сильного всегда бессильный виноват и автор публикации Иван Анташкевич, наслаждаясь такой возможностью, упражняется в словоблудии. В результате вот такая стряпня.

СТАТЫСТЫКА

Самая бедная беларуская сям’я — шматдзетная

А больш за 70% беларускіх сем’яў жывуць на даходы менш чым 300 долараў на чалавека.

Белстат апублікаваў даныя “Аб змяненні ўзроўню жыцця насельніцтва Рэспублікі Беларусь у 2012 годзе”.

Аказваецца, самымі беднымі ў Беларусі з’яўляюцца сем’і з двума і больш дзецьмі — 65,8% з іх вымушаны існаваць менш як на 1,6 млн на чалавека, што складае сёння каля 185 долараў. Абсалютная ж большасць беларускіх сем’яў, менавіта 70,1% у месяц могуць выдаткаваць менш чым 2,5 млн на аднаго члена сям’і. Па сённяшнім курсе гэта прыблізна 290 долараў.

Увогуле вынікі апытання наводзяць на думку, што ў Беларусі самыя багатыя ў сэнсе фінансаў — адзінокія людзі і сем’і без дзяцей. Даходы больш за 3 млн на чалавека маюць 26,6% адзінокіх беларусаў, 23,2% сем’яў без дзяцей, і толькі 8% сем’яў з дзецьмі (4,5% сем’яў з двума і больш дзецьмі).

Варта таксама адзначыць, што беларусы па-ранейшаму ледзь не палову сваіх даходаў аддаюць на харчаванне, што сведчыць пра нізкі ўзровень жыцця. У развітых краінах на харчаванне грамадзяне расходуюць у сярэднім 20% сваіх даходаў.

Ганна ГАНЧАРЫК.

ІНВЕСТЫЦЫІ

Вярнуць бязвыплатна!

Беларусь скасавала інвестыцыйную дамову з Аманам на 150 мільёнаў долараў і будзе вяртаць у дзяржаўную ўласнасць землі ў цэнтры Мінска.

Як вядома, яшчэ ў 2010 годзе з дзяржаўным рэзервовым фондам Султанату Аман была падпісана інвестыцыйная дамова, паводле якой у цэнтры Мінска (раён “Белэкспа”) меў з’явіцца шматфункцыянальны гатэльны комплекс. Участак быў прададзены аманскаму боку ў прыватную ўласнасць за 10 мільёнаў долараў без аўкцыёну. Чакалася, што рэалізацыя праекта пачнецца ў 2011-м і завершыцца да 2016 года. Аднак летась аманскі бок адмовіўся ад інвестыцыйнага праекта, палічыўшы яго нерэнтабельным.

І вось зараз Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які ўступіў у сілу 1 сакавіка і згодна з якім, кампанія “Арол Пропэртыз чатыры”, створаная для рэалізацыі праекта, павінна бязвыплатна вярнуць у дзяржаўную ўласнасць зямельны ўчастак пад будаўніцтва. Таксама кампанія павінна вярнуць перададзеныя ёй ва ўласнасць Нацыянальны выставачны цэнтр “Белэкспа”, 2-ю Гарадскую клінічную бальніцу і іншыя будынкі. Атрымліваецца, што, калі сталіца і не атрымала шматфункцыянальны комплекс, 10 мільёнаў долараў бюджэт зарабіў.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ОСОБОЕ МНЕНИЕ

Валерий КОСТКА

О выборах, бойкоте, площади, «едином» и «непобедимом»

Позволю по столь непростым вопросам высказать свое мнение с позиции рядового гражданина Республики Беларусь и избирателя, поскольку в "мышиной возне" в борьбе за власть не участвую. Это не критика, а моя гражданская позиция, мое видение происходящих процессов, а учитывая то, что отношу себя к категории Народ, то это и мое требование и к власти, и к оппозиции как представителя первоисточника власти. Итак...

О выборах

Это самая главная проблема нашего общества. Выборов у нас нет. Выборов, которые определены Основным законом (Конституцией) Республики Беларусь. Выборов честных, прозрачных, демократичных, свободных. С равными условиями для претендентов на избрание. Это понимают и знают те, кто у власти, это понимает "оппозиция" и уже понял народ. Власть установила свои избирательные правила, противоречащие основным вышеперечисленным конституционным принципам. По этим правилам не предусматривается смена власти, ни при какой стратегии и тактике "оппозиции". Нельзя оправдать действия режима, нарушающего Конституцию Республики Беларусь, но понять его стремление править вечно, можно.

Логику поведения "оппозиции" нельзя понять и тем более оправдать. На прошедших осенью парламентских "выборах" многие избиратели проигнорировали этот "спектакль", понимая, что их голоса никакого значения на результат не имеют. Результат был известен до выборов. Аргумент "оппозиционеров", принявших участие в "выборах": *"Мы идем в народ, чтобы донести до него, что выборов в Беларуси нет! Избирательное законодательство не позволяет провести выборы в соответствии с Конституцией Республики Беларусь".* Хорошо, донесли. Народ и без вас это уже понял. Ну тогда объясните мне, избирателю, в каких выборах вы собираетесь участвовать в 2014-м и 2015 году? Выборов в Беларуси **НЕТ!!!**

Политолог А.Класковский объясняет необходимость участия "оппозиции" в президентских выборах 2015 года тем, что на этих выборах в "оппозиции" определится "единый кандидат", который (если звезды правильно сойдутся) имеет шанс победить на президентских выборах 2020 года. Гениально! Очередную премию А.Класковскому от Администрации президента в номинации *"за самый благоприятный прогноз для режима".* А куда, господин политолог, вы денете своих *"тяжеловесов"* А.Милинкевича и В.Некляева? Им ведь к тому времени восьмой десяток пойдет.

Попробую смоделировать ситуацию в расстановке политических сил в Беларуси, которая сложилась за 19 лет правления диктатуры. Если мы признаем, что в Беларуси существует авторитарный режим во главе с диктатором, тогда мы должны признать, что в Беларуси нет оппозиции и нет реальных политических партий. Остается только камуфляж и от оппозиции и от партий. По законам диктатуры, любая политическая сила, сильный лидер и организованная оппозиция подлежит уничтожению, потому что угрожают власти диктатора. Диктатура оставляет существовать только тех, кто или в силу своей ничтожности как политической силы, не способен конкурировать с режимом, или тех, кто втайне от народа сотрудничает с властью, представляясь "оппозицией". Власти такая "оппозиция" нужна для того, чтобы демонстрировать "спектакли" под названием "демократические выборы". А с другой стороны, карманная "оппозиция" никогда не ставит задачи победить на выборах. На выборы она всегда идет с олимпийским лозунгом: "Главное не победа, а участие".

Уничтожая реальную оппозицию, карманная "оппозиция" не может заменить ее и, соответственно, теряет свое влияние в обществе. На призывы "оппозиции" участвовать в выборах или бойкотировать их избиратель не реагирует и поступает, руководствуясь своим умом. Парламентские выборы наглядно продемонстрировали, кто есть кто. Не народ (избиратель) шел за призывами политиков, а политики определялись, с кем они. Кто выступил за бойкот, тот поддержал трезвомыслящих избирателей. Кто поиграл в "выборы", тот оказал услугу режиму по проведению выборов, которых **НЕТ.**

С другой стороны, делая оппозицию слабой, власть сама слабеет и начинает "бронзоветь". В политике, как в спорте. Нет сильного спарринг-партнера — падает мастерство и физическая форма. Кроме того, все диктатуры живут на падающем рейтинге, и скорость падения рейтинга зависит от ресурса доверия избирателей и финансового ресурса диктатуры. Поэтому позволю не согласиться все с тем же политологом А.Класковским, что рейтинг А.Лукашенко (вдруг ни с того ни с сего) замер на отметке 30%. Какие объективные обстоятельства на это повлияли? Может, рост цен на электроэнергию, газ, коммуналку, продукты питания? Может, рост инфляции и негативные ожидания в обществе очередной девальвации? Или рост оплаты студентам за обучение и сокращение бюджетных мест в вузах? Рост перечня платных услуг в поликлиниках? А может, вынужденная трудовая и политическая эмиграция? Бюрократии меньше стало, коррупции? В чем увидел политолог позитивные явления в обществе? Рейтинг как падал, так и продолжает падать. А в одной номинации все равно двух премий не дают. Власть объективно и закономерно теряет своего избирателя.

Таким образом, с одной стороны, политическая элита (власть и оппозиция) теряют доверие народа, с другой стороны, происходит сращивание власти и "оппозиции". Народ, не удовлетворенный деятельностью политической элиты и все в большей степени осознающий себя первоисточником власти, готовится к политической реформе власти по правилам, которые установил в своем основном общественном договоре — Конституции Республики Беларусь. **Линия "фронта" проходит не между властью и оппозицией, а между политической элитой и народом.**

О бойкоте

Диктатура, установив свои правила игры за пределами правового конституционного поля, тем самым обеспечивает себе победу на любых выборах независимо от стратегии и тактики оппозиции. Единственная проблема, которую не может обойти диктатура, это проблема участия или неучастия избирателей в спектакле под названием "выборы". Как ни крути, но и при демократии, и при диктатуре народ остается первоисточником власти, а выборы — это не просто игра в "фантики" с фамилиями кандидатов, это процедура делегирования власти каждого избирателя своему кандидату. Власть избранного состоит суммарно из власти каждого избирателя. При диктатуре не важно, каким путем завладеть голосом избирателя — обманом или подкупом (хотя по закону это мошенничество), или грубой фальсификацией (а это уже незаконное присвоение властных полномочий). Кто будет судить? Никто. Все свои. А как быть, если народ не подойдет к урнам? Тогда власть потеряет властные полномочия.

Поэтому и заволновалась госпожа Л.Ермошина и поторопилась в избирательный закон внести поправки на запрет агитации за бойкот на государственные средства. А государственные средства — это не народные ли средства? Имеет ли право парламент, сформированный с нарушением законодательства, принимать законодательные акты? И кто, и кому позволил ограничивать конституционное право народа самому решать — участвовать или не участвовать в выборах и за кого голосовать?

Бойкот — это единственный конституционный способ, к тому же мирный способ, заставить власть вернуться в конституционное поле и предоставить право первоисточнику власти — НАРОДУ — избрать себе власть в открытых, честных, прозрачных выборах. Это честно, это справедливо и это законно. А кто против?

У оппозиции по правилам диктатуры шансов на победу НЕТ. На конституционном поле шансы у всех кандидатов равны, а народ решит, кто лучше и сильнее. Вопрос об избирательном законодательстве для честных и истинных оппозиционеров — это вопрос номер один. Поэтому для политиков, придерживающихся оппозиционных взглядов, и для народа настало благоприятное время (учитывая бойкот парламентских выборов) объявить власти ультиматум — или новое законодательство по выборам, гарантирующее полный контроль и прозрачность выборов, или бойкот "выборов" по правилам диктатуры.

В Музее современного изобразительного искусства завершилась персональная выставка Владимира Цеслера — возможно, самого известного белорусского художника на родине и за рубежом. Его называют легендарным, модным, оригинальным, неординарным. И хулиганским тоже называют... На творческую встречу с художником, как всегда, набилось уйма народу. Молодого, незашоренного, ершистого. К маститому Цеслеру у них накопилось много вопросов. Может быть, потому, что Владимир Яковлевич напрочь лишен менторства. Он не склонен учить. И за это его любят слушать.

О дизайне

— Сейчас это слово стало расхожим. Люди, которые оформляют квартиры, тоже называют себя дизайнерами, хотя они — оформители. А дизайнеры — те, кто придумывает новые технологии для решения интерьерных задач. Оформители пользуются их плодами. У дизайнера, прежде всего, в лексике отсутствует слово "украшательство", у него задача попытаться посеять новое зерно в окружающий мир и, таким образом, мир изменить. И человека изменить — его отношение к предметам. Дизайн решает технологические вопросы: чтобы предмет хорошо продавался, чтобы пошла серийность. Дизайн работает для промышленности. Мне таких предложений никогда не поступало. Я не дизайнер, я художник.

Об автомобилях

— Наконец сейчас мы пытаемся сделать автомобиль не роскошью, а откровенным транспортом. Сегодня никто не делает автомобили на века. Американцы в 1960-х делали шевроле, кадиллак, эльдорадо. Сейчас такое никто не создает. Все временное. Потому что стоит другая задача: машина должна служить примерно 10 лет и не больше.

Об архитектуре

— Мы отстаем... И архитектура наша в том числе отстает. Та, которая пришла сегодня к нам в Минск, — большие, стеклянные здания, — если разобраться, этому хайтеку уже 80 лет. Кто был в Европе, видел, что там зеркальные стекла не такие уже и зеркальные. Со временем анодированный алюминий тоже выглядят совершенно беспомощно. А вот здания романской архитектуры X века до сих пор привлекательны.

О красной звезде на шапочке

— Я ношу кепку с красной звездочкой. Это дань китайским традициям. Вот у нас почти нет своих праздников — мы задушили их, как могли. Раз нет своих, приходят чужие: Святого Валентина и хэллоуин. Нет своих игр: ушла лапта, ушел пристенок — монетки-то исчезли... Мы не играем в штангу — будем играть в бейсбол. А в итоге мы будем жить так, как будем относиться к своим традициям. Мы ответственны, чтобы традиции не прервались. Это важно. Потому что это диалог с прошлым, с теми, кто жил до нас. В некий назначенный день мы делаем то, что делали люди и 50, и 100 лет назад. И, таким образом, мы общаемся с ними. И с будущими поколениями тоже! Важно, чтобы этот момент не прервался.

О деньгах

— Если ты стал художником, то с деньгами поздно разбираться. Назад пути нет: будут тебе платить или нет, ты все равно будешь работать. На Западе очень мало художников, которые живут с искусства и не моют по вечерам или по утрам стаканы в кафе или еще что-то. Художник либо хорошо работает, либо хорошо продается. Одно из двух. Художники приходят в этот мир не хорошо зарабатывать, а получать удовольствие от своей работы.

За серию "12 из XX" покупатель, директор "Анекс Групп", давал 400 тысяч долларов. Правда, разговор шел через посредника. Я просил больше. Это не огромные деньги. Поэтому я и не заработал.

О критике в собственный адрес

— Могу сказать: к критике и похвале отношусь одинаково равнодушно. Как правило, хвалят не за то, и ругают тоже не за то. Нужно знать себя, свои минусы и плюсы, и работать. Ни в коем случае не подстраиваться! Вы же знаете, нужно быть очень смелым блогером, чтобы не ругать то, что все ругают. А меня не ругают, меня обсуждают. Ни похвала, ни хула — это меня не держит.

Вчера в Союзе дизайнеров сняли мою кандидатуру с премии союзного государства. Чем аргументировали? Я не спрашивал.

О публике

— Публика везде одинакова. Как и художники. Люди всюду люди. Мы все стоим в одном мировом строю. Но наш зритель все-таки интереснее. В жирной Европе зритель почему-то тяготеет к вышитым подушечкам. Но если ты хочешь стать более состоятельным, то лучше туда. А здесь зато можно работать спокойнее и не заботиться, понимает тебя зритель или нет. Денег нет, но прожить можно. А там все-таки надо думать о рынке, о его законах.

О любви

— Верю в любовь с первого взгляда. Верю и ошибаюсь.

О Сергее Войченко

— "Яйца" мы делали вдвоем. Это было давно, и снова говорить, как мы придумали проект "12 из XX"... Идея возникла и возникла. Вообще, идей тысячи. Идея — это еще ничего. Они лежат кипой. Как до них добраться, где найти денег для воплощения? Сделано процентов семь от задуманного. За такую работу, как "Яйца", я бы никогда больше не взялся. Потому что почувствовал неблагодарность, бесполезность...

Войченко был непокладистый. Как и я. Мы боролись. Но вдвоем легче придумывалось. А работать вдвоем — нет, не легче. Наоборот, он был очень ленивый. Выставки его не интересовали совершенно. В общем-то, меня уже тоже. Выставка для меня, скажу сразу, большая трагедия. Отдачи-то нет. Ты знаешь, что работы не купят. Скорее всего работы повредят. У нас на Венецианском биеннале одно яйцо разбили. Никто за это не заплатил. Люблю ли свои работы? Только ту, которую делаю в данный момент. И ту, что планирую в будущем. О прошлых не вспоминаю. Какой смысл?

О зависти

— Завидовать нечему, потому что конкуренции нет. У меня, к слову, в этом месяце одну работу не купили, а у соседа не купили две. Чему завидовать? Арт-рынка ведь нет.

Елена МОЛОЧКО.

КУЛУАРЫ

Радзівона Баса «сышлі» са «Славянскага базару»

У сецівe з'явілася інфармацыя, згодна з якой нязменны кіраўнік цэнтра культуры "Віцебск" і дырэктар "Славянскага базару" Радзівон Бас нібыта сышоў з пасады.

Запытацца ў самога Баса, наколькі праўдзівыя чуткі аб яго добраахвотным сыходзе з пасады, не атрымалася. У дырэкцыі цэнтра культуры "Віцебск" "Народнай Волі" паведамілі, што зараз ён знаходзіцца на бальнічным. Пры гэтым адзначылі, што чакаюць кіраўніка на рабоце.

Паводле regnum.ru, Радзівон Бас напісаў заяву аб звальненні 1 сакавіка: *"Гэты крок Баса, па неафіцыйнай інфармацыі, звязаны з тым, што некаторы час таму яго першым намеснікам замест Вольгі Сальнікавай (адначасова і жонкі Р.Баса) быў прызначаны намеснік начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Сідарэнка. Акрамя таго, у апошні час узмацнілася крытыка з боку ўлад фармату і ўзроўню правядзення "Славянскага базару", у тым ліку і "засілля расійскай эстрады".*

"Славянскі базар", які сваім існаваннем абавязаны шмат у чым менавіта Радзівону Басу (удастоены звання Ганаровага грамадзяніна Віцебска), з'яўляецца найбуйнейшым фестывалем мастацтваў, даўно атрымаў міжнароднае прызнанне і вядомасць, адыгрывае значную ролю ў захаванні агульнаславянскай культурнай прасторы. Змена кіраўніцтва фестывалю за тры месяцы да яго пачатку ставіць правядзенне свята пад пагрозу. Сідарэнка, які да гэтага меў толькі досвед работы па лініі прапрэзідэнцкай маладзёжнай арганізацыі "БРСМ" і маладзёжнай палітыкі, з'яўляецца абсалютна нераўназначнай заменай Басу — колькі б крытычных заўваг на адрас апошняга ні выказвалі".

НЕ ПРОПУСТИТЕ!

Каннские львы снова в Минске

22 марта в концертном зале "Минск" пройдет ежегодный показ лучших видеороликов мира, победителей Международного каннского фестиваля рекламы-2012.

Организаторы фестиваля обещают показать лучшие рекламные ролики, получавшие Гран-при фестиваля за последние 20 лет. Особая часть программы — ставшее уже традиционным подведение итогов конкурса среди молодых рекламистов, победители которого поедут в Канны в июне этого года представлять Республику Беларусь.

Оценить рекламные шедевры смогут все желающие: билеты на мероприятие уже в продаже.

УРАЖАННІ

Экскурсія з прэзідэнтам

Падрабязнае знаёмства з экспазіцыяй Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці так і не дапамагло мне зразумець, якіх жа рэчаў усё-такі там не хапае...

Прастор для разгулу фантазіі тых, хто ў гэтым музеі ніколі не бываў, проста бязмежны! Цікава, ці прадстаўлены тут герб з "Пагоняй" і бел-чырвона-белы сцяг? А як наконт вершаў Рубінава і Быкава? І ці праўду кажуць, што ў музеі ёсць партрэт Лукашэнкі ў поўны рост?

Вывучэнне "асартыменту" ўстановы пакінула неадназначнае ўражанне, як мне здаецца. Змяшалі боб з гарохам, а потым паставілі ў вітрыну. Гэта не жарт — некаторыя злакавыя і бабовыя культуры прысутнічаюць у той частцы экспазіцыі, што распавядае аб сельскай гаспадарцы Беларусі.

З першых вітрын на наведвальніка глядзіць... Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Ён жа і віртуальны праваднік па выставе. Амаль з кожнага стэнда пазірае пільна — тут асвойвае камбайн, там ідзе з шахцёрамі, а вось ён у ваеннай форме глядзіць у светлую будучыню, абдымаючы сына Колю...

За шклом пасведчанне прэзідэнта, стары пашпарт прэзідэнта, заява прэзідэнта ў Цэнтрвыбаркам, першая праграма будучага прэзідэнта ўзору 1994 года. Яшчэ ёсць драўляны макет Канстытуцыі і дакументы з малю-ю-ю-сенькімі "Пагонямі".

Мусіць, тут народная падтрымка не патрэбна — нешта падказвае, што гэтую частку экспазіцыі мяняць не збіраюцца.

Ідзём далей. У вітрынах, як на кухонных палічках у дбайнай гаспадыні, бутэлечкі з нафтапрадуктамі, бабы і зерне, агромністая бутэлька з нейкім рэчывам, на якой напісана "Соль". Усім гэтым багата Беларусь! А вось у наступнай вітрыне... пазваночнік. Здзіўляюся. Навіна аб тым, што беларусы прыдумалі пазваночнік, падалася нечаканай... Прачытала анатацыю — выдыхнула. Аказалася, так праілюстравалі дасягненні ў медыцыне.

Я ганаруся нашымі спартсменамі, але не вельмі разумею, якім бокам жаночая алімпійская форма, ракетка **Вікторыі Азаранка** і спартыўны касцюм **Дар'і Домрачавай** тычацца беларускай дзяржаўнасці. Уласна кажучы, як і тэатральныя касцюмы ці мадэлі трактарчыкаў і пагрузчыкаў.

Затое перад вітрынай з беларускай валютай можна "заліпнуць" на гадзіны. Тут і зайчыкі, і вавёрачкі, і мільёны, і сучасныя двухсоткі... Цікава паглядзець, як ад аднаго нуля мы дабіраліся да шасці і назад. А яшчэ цікавей разглядаць прэзідэнцкія падарункі. Тут і ордэны з Венесуэлы, і вазы з Кітая, і нават драўляны карабель.

Прыгожа і пазнавальна, але хоць забіце мяне — не магу зразумець, чаму гэтая экспазіцыя размешчана ў Музеі беларускай дзяржаўнасці, а не ў музеі дасягненняў ці музеі таго, чым беларусы могуць ганарыцца? Ну праўда, надта падобны Музей беларускай дзяржаўнасці да музея капітал-шоу "Поле чудес". У Літве, напрыклад, алімпійскія медалі не лічаць заганным выстаўляць проста на аэравакзале. Там, дзе іх могуць бачыць і грамадзяне, і госці. А не ў будынку, патрапіць у які можна толькі праз тры дні пасля заяўкі...

Марыя МАЛЕВІЧ.

БЛІЦ

А што б вы перадалі Музею сучаснай беларускай дзяржаўнасці?

Глеб ЛАБАДЗЕНКА, журналіст, блогер, пісьменнік:

— Я перадаў бы ў музей свае здымкі з першай і другой Плошчы — лічу, што гэтыя падзеі важныя для нашай дзяржаўнасці. Перадаў бы лісты з няволі ад Зміцера Дашкевіча і Паўла Севярынца — гэтыя людзі адбываюць пакаранне за любоў да Беларусі і прагу абараняць нашу дзяржаўнасць... А з якой умовай? Каб перададзеныя рэчы экспанаваліся.

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня АГП:

— Я магу перадаць экзэмпляр Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, дзе стаяць каля 20 подпісаў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання, якія прымалі гэты дакумент. Ён павінен быць добрым напамінам усім нам. У Літве, напрыклад, падобная дэкларацыя з подпісамі ўсіх дэпутатаў сейма вісіць ва ўсіх дзяржаўных установах. Бо гэта насамрэч найважнейшы дакумент.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ, палітык:

— Гэтаму музею я нічога не прапаную — няхай там павесяць на ўсёй плошчы партрэты Лукашэнкі. Гэты музей не можа лічыцца сапраўдным, бо тая гісторыя, што распавядаецца ў ім і выкладаецца ў сучасных падручніках, служыць на карысць толькі адной асобы і не заслугоўвае павагі. Упэўнены, я знайшоў бы некаторыя цікавыя рэчы, што маюць дачыненне да беларускай дзяржаўнасці, але перадаваць іх у такі музей я жадання не маю.

Пётр КРАЎЧАНКА, былы міністр замежных спраў Беларусі:

— Я не даю інтэрв'ю, а адказ на гэтае пытанне — менавіта інтэрв'ю.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Ажыятаж на «Паўстанцаў»

Днямі ў кнігарні "Логвінаў" прэзентавалі гістарычную беларускамоўную гульню "Паўстанцы". Народу сабралася нямала — у зале быў аншлаг.

Ідэя стварэння першай беларускай настольнай гульні пад назвай "Паўстанцы" належыць маладому гродзенскаму паэту і празаіку, выкладчыку рэжысуры абрадаў і святаў **Антону Янкоўскаму** і дызайнеру **Настассі Лукашковай**.

"Некаторы час назад мы заўважылі, што ў нас наогул няма беларускіх настольных гульняў, — расказаў Антон. — *Наша ідэя спачатку ўзнікла як жарт, а потым перарасла ў сур'ёзную справу".*

"Паўстанцы" — першая настольная гульня, у якой можна паглыбіцца ў атмасферу 1863 года і зрабіцца знакамітай гістарычнай асобай. Яе падабенства са знакамітай гульнёй "Мафія" адразу кідаецца ў вочы. Але як адзначаюць яе стваральнікі, "Паўстанцы" — удасканалены і дапрацаваны беларускі аналаг. Тут іншыя правілы, усё на беларускай мове і ёсць гістарычны сэнс.

Ідэя гульні простая: мэта ігракоў, якія выконваюць ролю паўстанцаў, рассакрэціць і ліквідаваць царскіх службоўцаў, мэта "царскіх салдат" — зрабіць тое самае з "паўстанцамі". Мэта простых "беларусаў" — выжыць і перайсці на адзін з бакоў супрацьстаяння. Усё, як у жыцці.

Удзельніку можа выпасці карта з "расстрэлам", ён можа атрымаць раненне ў збройнай сутычцы.

Як адзначаюць Антон і Настасся, гульня пабудавана найперш на зносінах паміж людзьмі, абмеркаванні і выказванні сваёй пазіцыі. Падманваць, хлусіць, па-майстэрску блытаць прысутных і бязлітасна забіваць саперніка — права кожнага ўдзельніка.

Варта адзначыць, што дызайн гульні, якая складаецца з картак, зроблены выдатна.



Паўдзельнічаць у "Паўстанцах" адразу можа ад 6 да 20 чалавек. Кошт гульні у простым льняным чахле — 100 тысяч, падарачны варыянт у скураным чахле — 150. Але колькасць экзэмпляраў абмежавана.

"*Калі паўгода таму мы пачалі распрацоўваць гэту гульню, то нават і не думалі, што будзе такі ажыятаж. Мы пабачылі шмат каментарыяў у інтэрнэце, нібы нейкая "апазіцыя" даслала нам грошы. Але гэта хлусня. Мы зрабілі ўсё за ўласныя сродкі. Таму, на жаль, зараз не ўсе змогуць яе набыць"*. Але, як паабяцалі Антон і Настасся, у хуткім часе ў кнігарню "Логвінаў" паступіць шмат новых "Паўстанцаў".

Карына АДЗЕСЕНКА.

ЧУЛІ?

Каб адкрыць рэстаран у Мінску, патрэбна мець мільён долараў

Напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі, што пройдзе ў Мінску ў 2014 годзе, беларускія чыноўнікі сур'ёзна ўзяліся за інфраструктуру горада. Літаральна на кожным вольным кавалачку зямлі ў цэнтры горада будуюць новыя гатэлі, таксістаў вучаць англійскай мове, і, вядома, абдзяляюць увагай кавярні і рэстараны. На пачатку года намеснік міністра гандлю **Вячаслаў Драгун**, напрыклад, паскардзіўся, што не хапае ў сталіцы месцаў, дзе б кармілі беларускімі нацыянальнымі стравамі.

"У Мінску зараз у модзе рукала, крэветкі, казіны сыр і вараныя буракі, — распавяла заснавальнік сеткі рэстаранаў "Стары горад", "Пінта", "Пипл'с". **Таццяна Галуза.** — *На пачатку 2000-х гадоў часцей замаўлялі стравы з маянэзам, кілбаску, скварачкі. Сёння такая ежа не папулярная"*.

Сталічныя рэстаратары адзначаюць, што на ўзроўні горада няма ніякай схемы кропак грамадскага харчавання. У тым ліку і з пункту гледжання таго, што там гатуюць. Таму гасцям сталіцы часта падаецца, што на відных месцах у нас толькі піцэрыі і сушы-бары, а знайсці добрае месца для новага рэстарана проста немагчыма.

"Мала хто хоча адкрываць кафэ ў мікрараёнах, — выказаўся дырэктар рэстаранаў "Камяніца", "Беларуская карчма", "Агінскі" **Сяргей Чагрынец.** — *А ў цэнтры горада складана знайсці памяшканне ў арэнду. І каб адкрыць кавярню на 40—50 пасадачных месцаў у цэнтры горада, сёння трэба ўкласці мільён долараў"*.

Між іншым, непамерныя апетыты ўлад — адна з прычын, па якой на беларускі рынак дагэтуль не прыйшлі многія папулярныя заходнія сеткі харчавання. Бізнесмены проста лічаць немэтазгодным распачынаць тут справы.

Іншая праблема з ліку гіперактуальных — адсутнасць персаналу. Нават тое, што па даных міжнароднай статыстыкі, у рэстаранай сферы самы высокі тэмп кар'ернага росту, не падштурхоўвае маладых людзей сур'ёзна ставіцца да працы повара, бармена і тым больш афіцыянта.

"90% афіцыянтаў — выпускнікі школы і студэнты, — падкрэсліў Чагрынец. — *Я лічу, што навукова-вытворчым камбінатам даўно пара даваць магчымасць дзецям яшчэ ў школе авалодаць гэтай прафесіяй. Так будзе фарміравацца і культура працы, і культура наведвання рэстаранаў і кавярняў"*.

З наведвальнікамі, па прызнанні рэстаратараў, у нас таксама не ўсё добра. Часам даходзіць да смешнага. Напрыклад, людзі нясуць з рэстаранаў і кавярняў посуд, наборы для солі і перца, сурвэткі і нават... трымальнікі для паперы ў прыбіральнях і выкарыстаныя ёршыкі...

Іншыя скаргі гучалі ўжо не так камічна. Спадар Чагрынец, напрыклад, адзначае, што не прызвычаіліся беларусы раніцай піць каву ў кавярнях, а па-ранейшаму робяць гэта дома. І рэгулярныя вячэры за рэстаранным столікам дазволіць сабе можа не кожны. Праўда, адзінагалосна эксперты-рэстаратары адзначаюць, што кошты ў беларускім *"общепите"* панізіць ну ніяк не атрымаецца. Бо жыццё складанае і есці хочацца ўсім. Нават тым, што гэту паслугу прапаноўвае.

Марыя МАЛЕВІЧ.

ПО ПОВОДУ

Свой марафон...

50 лет для спорта — не предел. Так считает динамовец, бывший мастер спорта СССР по боксу, а ныне большой любитель марафонских пробегов Александр Супранович.

Александр рассказывает, что после десяти лет активных занятий боксом повесил перчатки на гвоздь, так как к тому времени окончил вуз и обзавелся семьей. Позже случилось горе — ушли из жизни родители. И тут он не смог совладать с таким стрессом. Начал курить, выпивать, но... Не сразу, но нашел-таки в себе силы вернуться к здоровому образу жизни. В этом ему помогли настоящие друзья и... спорт — бег на длинные дистанции.

На сегодняшний день на счету Александра Супрановича несколько десятков марафонских пробегов. В том числе и такие известные, как в Нью-Йорке и Москве...

Александр вспоминает, что во время финиша на Красной площади у него было такое ощущение, что снова вернулся в большой спорт. Тогда он понял, что марафон — это навсегда. И вот сейчас ему уже за 50, но он постоянно ставит личные рекорды.

У Александра Супрановича есть заветная мечта — пробежать путь древнегреческого воина до Афин! И еще... Очень хотелось бы, чтобы международные марафоны стали традиционными и в нашей столице. Чтобы марафонцы разных возрастов своими примерами могли агитировать за здоровый образ жизни.

— У каждого человека, как мне кажется, должен быть свой жизненный марафон, — говорит Александр.

Юрий ЯСИНСКИЙ, ветеран спорта, заслуженный тренер БССР.

Минск.

ШАШКІ

Беларуская школа

Па шашачнай кампазіцыі яна займае перадавыя пазіцыі. Яе прадстаўнікі Пётр Шклудаў (Наваполацк), Аляксандр Кагоцька (Пінск) і Мікалай Грушэўскі (Мінск) трыумфальна выступілі ў планетарным першынстве па складанні камбінацыйных праблем-64 PWCP-1: заваявалі залаты, сярэбраны і бронзавы медалі адпаведна. Анатоль Шабалін з Мінска з'яўляецца чэмпіёнам свету ў раздзеле стаклетачных задач. У лік лідараў таксама ўваходзяць мінчане Віктар Шульга, Васіль Грабенка і Іван Наўроцкі, Аляксандр Сапегін з Усполля Мсціслаўскага раёна, Аляксандр Ляхоўскі з Жодзіна, Мікалай Баброўнік з Мазыра, Мікалай Зайцаў з Баранавічаў.

А вось яшчэ адна прыемная навіна: Віктар Шульга ўзначаліў Сусветную камісію па кампазіцыі ФМЖД. Ён — чэмпіён Беларусі, бронзавы прызёр чэмпіянату свету ў жанры малых праблем на 100-клетачнай дошцы, міжнародны майстар.

«Пінск-2012»

Гэты конкурс меў міжнароднае значэнне. Нядаўна падведзены яго канчатковыя вынікі. У катэгорыі А (мініяцюры-64) лаўрэатамі сталі Валдар Беляўскас (Літва), А.Кагоцька, П.Шклудаў, М.Грушэўскі і ўкраінец Анатоль Саўчанка. У катэгорыі В (камбінацыйныя праблемы-64) перамаглі А.Кагоцька, П.Шклудаў, мінчанін Мікалай Ляшкевіч і А.Саўчанка.

Пазнаёмцеся з творамі прызёраў:

1 (А.Кагоцька). **Белыя**: b4, b6, c5, c7, e5, f4, f6, g5 (8). **Чорныя**: a5, b2, c3, d2, d4, e3, f2, f8, h4 (9). Выйгрыш (83,33 ачка па змесце).

2 (П.Шклудаў). **Белыя**: a5, b2, b6, c1, c3, c7, d2, f2, g1, g3 (10). **Чорныя**: a3, a7, d6, d8, e5, f4, f6, g5, h2, h4, h8 (11). 81,66 ачка: b8, b4 (g7) b6, c5, de3, f8, e7, h6, fe3, a5 (b6) g5, f2+.

3 (М.Ляшкевіч). **Белыя**: a7, b6, c5, c7, d6, f6, g5, g7, h2, h6 (10). **Чорныя**: b2, c3, d4, d8, e3, e5, f2, f4, g3, h4 (10). 75,83 ачка: fe7, ab8, d8, h4, e5, b4, e5 (c1 **A**) f4, f4+. **A** (a1) f6, f8+.

4 (А.Саўчанка). **Белыя**: a1, b6, c1, c5, c7, d4, d6, e7, g1, g5 (10). **Чорныя**: b8, d2, d8, e3, f2, f6, h4, h6, h8 (9). 71,66 ачка: f8, e5, de7 (bb4) h6 cb2, c3, g7, g5, f2 (e5) e3+.

5 (В.Бяляўскас). **Белыя**: a7, b2, c5, d6, f4 (5). **Чорныя**: b6, d2, d4, e3, f2, f8 (6). 70 ачкоў: c3 (b2) e7 (b4A) c1, g1 (f4) f2+. A(g5) d8, a1 (e3) b8 (f2) g3, e5 (g7) h8, d4 (h2) g1+.

6 (М.Грушэўскі). **Белыя**: b4, b6, d2, d6, f4 (5). **Чорныя**: c3, d8, h4, h6 (4). 65,83 ачка: dc7 (e1) g5 (f4**AB**) b8, h2+. **A**(f6) b8, h8 (c7**C**) e5 (b6) d4 (a5) c3 (g5) d2 (h4) e1 (b4, g3) b6 (h2) g1#. **C** (g5) e5+. **B** (a5) b8 (f4 **D**) h2, b8+. **D**(f6) h2, b8+.

Рашаем разам

"Зарубежныя госці" (Ю.Голікаў): c7 (a5A) f2, g1, e3/c5/a7 (b4) c5, g7, fg3 (g5) f2 (h4B) hg3#. B(f4) hg3, g1#. A(c5) hg3, c7, ed4, gf4, fh8, d4 (f4) g3, g1#.

Мікалай ГЛАДКІ.

ОСОБАЯ ТЕМА

История Ирины Статкевич

Белорусское государство принято называть "социальным". А что это вообще такое — "социальное государство"? На мой взгляд, от других государственных моделей его должна отличать этика защиты слабых, обездоленных и больных. Всех тех, кого по каким-то причинам выбросило на обочину жизни и кто не в состоянии сам оттуда выкарабкаться. Одним словом, государство, готовое протянуть руку помощи попавшему в затруднительное положение гражданину.

История Ирины Статкевич, обратившейся за помощью в редакцию "Народной Воли", показывает, что в некоторых случаях наше государство "социальное" только на словах. По отношению к этой 39-летней женщине оно проявило черствость и отчуждение.

Диагноз как приговор?

Матери-одиночки — одна из наиболее уязвимых социальных групп в Беларуси. Именно к этой группе относится Ирина, у нее двое детей, мальчик Илья и девочка Дарья. Государство очень своеобразно помогло ей поставить их на ноги. Сначала отобрало маленького Илью, когда тому было всего несколько месяцев от роду. Теперь хочет помочь еще больше — отобрать 15-летнюю Дашу.

Вы думаете, детей можно отобрать по суду только у пьяницы, дебоширки и распутницы? Как бы не так! С 2007 года это может быть сделано во внесудебном порядке. И не обязательно даже создавать социально опасное положение для ребенка. Достаточно иметь одно из заболеваний, которое Минздрав считает несовместимым с выполнением родительских обязанностей. Например: злокачественные новообразования, болезни крови и кроветворных органов, болезни эндокринной системы, расстройства питания и нарушения обмена веществ с выраженными нарушениями функции органов и систем, астму, цирроз печени, стенокардию напряжения функционального класса III—IV, перенесенный в прошлом инфаркт миокарда, осложненный стенокардией, аффективные расстройства настроения, шизофрению.

Вероятно, многие из вас согласились, дочитав список до конца, что с чем-чем, а уж с диагнозом "шизофрения" точно лучше не иметь детей. Отношение к психически больным людям в нашем обществе далеко от гуманного. К ним зачастую испытывают неприязнь, раздражение и страх. Считают их по определению неполноценными, опасными и неизлечимыми.

Хотя в действительности психическая болезнь может зарубцеваться так же, как язва. Немало обладателей психиатрического диагноза живут обычной жизнью, учатся, работают, счастливы в семье. Подобный диагноз — не приговор и не клеймо. Вернее, не должен таковым быть. Но для Ирины Статкевич стал приговором и клеймом.

«Мать надлежащим образом выполняет свои родительские обязанности», но ребенка надо забрать

Все началось с неудачного опыта зубопротезирования. После которого, в 2007 году, Ирина легла в 9-ю Клиническую больницу города Минска, отделение челюстно-лицевой хирургии, с диагнозом "дисфункция височно-нижнечелюстного сустава". После 20 дней лечения она все равно чувствовала себя неудовлетворительно. И особенно сильно переживала по поводу своей внешности. Переживания переросли в нервный стресс. Чтобы снять его, Ирина легла в психо-неврологическую клинику. *"Я же не думала, что там вход рубль, выход — два. Просто хотела успокоить нервы, получить помощь. А вышла с клеймом...",* — говорит она. Ее жалобы сочли "бредом", в медицинском смысле слова.

Психиатрия — одна из самых субъективных наук, болезненных и проблемных отраслей медицины. А ведь психиатрические диагнозы, воспринимаемые как клеймо, могут в корне изменить жизнь теоретически абсолютно здорового человека...

Если же вы с таким "клеймом" заденете какого-нибудь чиновника, пускай даже самого мелкого, последствия могут оказаться плачевными. В 2008 году Ирина Статкевич подала заявление в РОВД Осиповичского района о том, что должностное лицо Вязьевского сельского исполнительного комитета выдало ее матери поддельную доверенность от ее имени на получение денежных средств. Кроме того, что дело было возбуждено не против должностного лица, а против матери Ирины, да и оно впоследствии закрыто, концовка этого эпизода оказалась совсем уж неожиданной. В рамках *"устранения нарушений законодательства о борьбе с коррупцией"* был вскрыт факт... что Ирина Статкевич состоит на учете в психо-неврологическом диспансере и *"по состоянию здоровья не осуществляет надлежащим образом уход и воспитание своей несовершеннолетней дочери". За что влетело педколлективу Вязьевской средней школы — "своевременно не проинформировали".* От такого сюжетного зигзага поневоле с ума сойдешь.

Впрочем, тогда дело было спущено на тормозах. Ирину в родительских правах не ограничивали, Дарью не забирали, все как-то улеглось. До тех пор, пока женщина не решилась родить еще раз, уже в 2011 году. "Вне брака", если говорить бюрократическим языком.

Мать этого решения, мягко говоря, не поняла и не приняла. Ирина уехала рожать в столицу, в РНПЦ "Мать и дитя". Роды были преждевременными и прошли тяжело, ребенок родился в асфиксии. *"У него лицо прямо черными пятнами пошло",* — вспоминает Ирина. Сами по себе роды — не только радость, но и боль, и стресс. Добавьте к этому отсутствие супружеской поддержки, непонимание близких родственников, весьма туманные перспективы на будущее. Скажете, сама виновата, зачем было рожать? Но ведь материнство — это все же радость и счастье.

Обратите внимание, что медики не отказывали ей в праве рожать, хотя их ведомство не признает за людьми с диагнозом "шизофрения" способностей выполнять родительские обязанности. Не предупреждали, что ребенок может быть отнят у нее в будущем. И не отняли его после рождения.

Впрочем, насладиться радостью и счастьем Ирине как раз не пришлось. Состояние послеродовой депрессии заставило ее видеть все в самом черном свете. В тяжелых родах — умышленную халатность врачей, в проблемах со здоровьем ребенка — происки матери, которая не приветствовала рождения внука. Ирина из Минска вернулась к ней в дом.

Ее бы кому-нибудь поддержать в это непростое время, помочь ей и успокоить. Увы, сюжет пошел по пути драмы. Обидевшись на обвинения дочери, мать нажаловалась местным властям, что та ведет себя "неадекватно". Хотя ничего из репертуара фильмов ужасов в ее жалобе не описывалось. В оборотня не превращалась в полнолуние, по ночам не гуляла, возвращаясь перемазанная кровью. Рядовые семейные дрязги. Но бюрократическая машина была запущена. Не на помощь в разрешении трудной ситуации, а на отобрание ребенка.

На этот раз все произошло быстро, несмотря на то, что прокуратура Осиповичского района обнаружила в доме, где жила Ирина с детьми, практически семейную идиллию, цитирую:

"При обследовании жилищно-бытовых условий семьи в деревне Вязье было выявлено, что семья проживает в кирпичном благоустроенном доме, в котором имеется 3 комнаты. В жилом доме созданы надлежащие условия для проживания и воспитания несовершеннолетних детей, имеется необходимая мебель и продукты питания, у девочки есть индивидуальное место для учебы и сна.

Несовершеннолетняя Дарья регулярно посещает ГУО "Вязьевская СШ", музыкальную школу в городе Осиповичи. Дарья всегда опрятно одета, у нее есть все необходимые школьные принадлежности, уроки девочка выполняет добросовестно и учится хорошо.

Мать надлежащим образом выполняет свои родительские обязанности по содержанию, уходу за несовершеннолетними детьми, не склонна к злоупотреблению спиртными напитками, не ведет антиобщественный образ жизни, интересуется учебой дочери в школе".

Ирина Статкевич с дочерью Дарьей.

Как-то не совсем логично отбирать ребенка после такого заключения, не правда ли? Но это, по-видимому, был заранее решенный вопрос. Ирине все же вменили в вину, что она *"своим поведением, образом жизни, отношением к своим несовершеннолетним детям ставит их в условия, опасные для их жизни и здоровья".* И это только потому, что она, случалось, оставляла малыша под присмотром Дарьи, 14-летней девушки, послушной и ответственной. Не редкость, когда в этом возрасте заводят собственных детей. А оставлять детей на старших братьев и сестер — это вообще обыкновенная практика.

Но если социальные службы видят в этом серьезную проблему, не лучше было бы ее решить путем оказания помощи матерям-одиночкам с присмотром за их детьми, когда это необходимо? Ведь такая необходимость может возникнуть по самым разным причинам.

В борьбе за сына

С того момента, как Илью забрали, жизнь Ирины, которая и до этого не была спокойной, превратилась в сплошную нервотрепку и борьбу. "Понимаете, это же не щенка забрали. Я как будто гибель своего ребенка пережила...", — устало говорит Ирина.

Пытаясь вернуть Ильюшу, добиться пересмотра своего диагноза, она обратилась во все инстанции, какие только есть. Генпрокуратуру, Верховный суд, Следственный комитет, КГБ, наконец, исчерпав список и собрав килограммы бумаги с формальными ответами, дошла до высшей точки — Администрации президента. Туда Ирина писала четыре раза. И каждый раз ее обращения снова спускали вниз.

— В результате безответственного подхода должностного лица к рассмотрению моих заявлений, содержащих крик матери о помощи, в настоящее время горячо любимый мною ребенок оказался в Бобруйском детском доме. И никакие просьбы... не нашли ***отклика в сердце*** *чиновников, все мои обращения они отправляли лицам, действия которых я обжаловала...,* — говорит Ирина. — *Отправила заявление в Верховный суд — безрезультатно, как обычно.*

Ирина насквозь пропиталась канцелярским языком и утонула в ворохе бумаг, в котором все труднее стало разбираться. Да, кое-чего она добилась. Илью перевели из Бобруйского детского дома в Минск. В Бобруйске, по словам женщины, малыш *"до мяса обсосал палец"* — не нашлось соски, чтобы ему дать. Ни памперсов, ни достаточного количества пеленок, ремонт в помещении посреди зимы, с запахами краски и ацетона, с открытыми окнами.

В столице ему намного лучше, но Ирине предстоит новый бой — за Дарью. Вскоре после того, как забрали Илью, девочку передали в семью отца по решению суда. Правда, там у нее жизнь не заладилась из-за скандалов, попреков и унижений. В итоге она снова оказалась с матерью. Живут на съемной квартире в столице.

«Медицинских оснований в настоящее время нет»

Социальные службы такое положение вещей не устраивает, Дарью уговаривают самой "сдаться" в приют. Хотя, как и раньше, никаких претензий к условиям проживания ребенка у них нет. В минувший четверг, когда я присутствовал на заседании Комиссии по делам несовершеннолетних в администрации Ленинского района, то пытался выяснить у председателя, Людмилы Михайловны Томашевич, в чем причина такого стремления оставить Статкевич без детей?

"Ну вы же понимаете, у нее диагноз ШИЗОФРЕНИЯ", — заговорщицки прошептала Людмила Михайловна.

Нет, не понимаю. Когда из Осиповичей отправлялся запрос в Минский психоневрологический диспансер, чтобы они подали исковое заявление о лишении Ирины дееспособности, оттуда ответили: для подачи такого заявления *"медицинских оснований в настоящее время нет".* Как оказалось, для отобрания ребенка это и не нужно, но разве такой ответ не свидетельствует о том, что по месту выставления диагноза болезнь женщины не считают такой уж серьезной?

"Не смотри на диагноз, смотри на меня!". Под таким лозунгом проводили в Европе акцию психически больные люди и их родственники, смысл которого очевиден. Может быть, нам тоже стоило бы отучиться от предубежденных взглядов?

Я разговаривал с другой женщиной, Леной Ю., которая одна воспитывает сына, почти ровесника Даши. Она страдала биполярным расстройством (входит в перечень Минздрава, по которому родитель якобы не может выполнять родительские обязанности), но откупилась в больнице, по ее словам, от диагноза. "И очень этому рада. Вы не представляете, как мне помогло в жизни отсутствие этого клейма. Только поэтому у нас сыном все сейчас хорошо". По-моему, надо вдуматься в это свидетельство.

***

Ирина выглядит измученной своей бумажной войной за детей с белорусской бюрократией. И все же ведет себя по нынешним меркам нестандартно: разговаривает с чиновниками гордо, упрямо и немного дерзко. Этого не любят, это кажется даже чем-то ненормальным. Разве белорусы не мирные и покорные люди, готовые как должное принимать любое решение их судьбы? Кто-нибудь скажет по-обывательски: "Сама же нарывается".

Конечно, я не врач. И не могу подменить собой Комиссию по делам несовершеннолетних. Как и взять на себя какую-либо ответственность в этом деле. И все же мне хочется верить, что в арсенале "социального государства" должно найтись еще что-то, кроме карательных, по сути, мер. Где-то, возможно, завалялись чуткость и осторожность, которые надо проявлять с живыми людьми. Существами ранимыми и хрупкими.

Дмитрий ГАЛКО.

КРЫЖАВАНКА

Рашэнне пачынаць з клетачкі з рыскай і далей па руху стрэлкі гадзінніка.

1.Пры паншчыне: стараста, назначаны памешчыкам. 2.Зімовая непагадзь. 3.Артыкул, прысвечаны памерламу, са звесткай пра яго жыццё і дзейнасць. 4.Беларускі савецкі кампазітар, аўтар оперы "Кветка шчасця" (пастаўлена ў 1940 г.). 5.Птушка сямейства качыных. Жыве ў тундры, на Беларусі бывае ў час пералётаў. 6.Горад у Брэсцкай вобласці. У XV—XVI стагоддзі належаў пінскім князям Давечаровічам. 7.Рыба ўсіх рэк Беларусі, а таксама праточных азёр, выкарыстоўваецца для лоўлі драпежных рыб. 8.Рукатворная праца студэнта над праслуханай лекцыяй. 9.Пачцівы паклон (жанчыны) з прысяданнем на правую нагу. 10.Стужкі волава ці яго сплаваў; ужываліся для вырабу электрычных кандэнсатараў. 11.Работа радыё па перадачы паведамленняў, навін і г.д. 12.Структура апусканняў зямной кары. 13.Дзяржава на Скандынаўскім паўвостраве. 14.Адзінка вымярэння вадкасцей у сістэме мер Вялікага Княства Літоўскага. 15.Птушка з адносна доўгімі нагамі і шыяй, дзюба ў якой пераважна доўгая і вострая. 16.Від дэфармацыі стрыжня. 17.Лекавае рэчыва медынскіх п'явак. 18.Расліна заліўных лугоў, кветкі якой жоўтыя, сабраны ў кошыкі. 19.Буквар у мінулую даўніну. 20.Электрамагнітны апарат, які служыць прыёмнікам у вібральнай тэлефоннай сувязі. 21.Тое, што лімоннік кітайскі. 22.З'явы культуры, побыту, успрынятыя ад мінулых часоў. 23.Адна з самых важных кармавых і харчовых культур. 24.Раённы цэнтр Віцебскай вобласці. 25.Прымяненне ведаў і навыкаў у жыцці. 26.Зубчатая, слупковая ці бугорчатая паверхня ўнутры горных парод. 27.Раздзел фізічнай хіміі, які вывучае скорасці хімічных рэакцый. 28.Футбольная каманда з Бабруйска, чэмпіёны краіны ў 1972, 1973 гадах. 29.Кніга з кароткімі і дакладнымі звесткамі аб чым-небудзь. 30.Сумятня, неразбярыха. 31.Вясёлкавая змена афарбоўкі на рэчывах. 32.Вучань пачатковай, сярэдняй школы. 33.Горад у Вялікабрытаніі з карціннай галерэяй Уокера. 34.Краіна ва Усходняй Еўропе. 35.Адна з дэкартавых каардынат пункта. 36.Загарода пасярод вуліцы падручнымі прадметамі. 37.Незвычайныя асаблівасці прыроды, з'яў, звычаяў аддаленых краін. 38.Руда на літый, каштоўны камень. 39.Удасканаленне існуючых і вывядзенне новых сартоў раслін, сельскагаспадарчых жывёл. 40.Штучнае абвадненне засушлівых зямель. 41.Тэлевізійнае прадпрыемства ў Мінску. 42.Прыбор, які ператварае гукавыя хвалі ў электрычныя для перадачы гукаў на адлегласці. 43.Арыфметычнае дзеянне. 44. "Чыноўнік" студэнцкай групы. 45.Клавішны музычны інструмент, від баяна. 46.Персанаж беларускіх народных казак - знаходлівы бядняк. 47.Апарат, якім ачышчаюць і раздзяляюць нафтапрадукты, прыродны газ. 48.Меліярацыйны канал асушальнай сеткі, да якога далучаюцца больш дробныя каналы. 49.Верхняе адзенне.

Склаў Уладзімір ЕСМАНТОВІЧ.

Мінск.



Адказы на крыжаванку

1.Бурмістр. 2.Завіруха. 3.Некралог. 4.Туранкоў. 5.Гуменнік. 6.Драгічын. 7.Шчыпоўка. 8.Канспект. 9.Рэверанс. 10.Станіёль. 11.Вяшчанне. 12.Упадзіна. 13.Нарвегія. 14.Кватэрка. 15.Жураўель. 16.Кручэнне. 17.Гірудзін. 18.Дзівасіл. 19.Лемантар. 20.Селектар. 21.Шызандра. 22.Спадчына. 23.Кукуруза. 24.Шуміліна. 25.Практыка. 26.Стылаліт. 27.Кінетыка. 28."Будаўнік". 29.Даведнік. 30.Кавардак. 31.Ірызацыя. 32.Школьнік. 33.Ліверпуль. 34.Беларусь. 35.Ардыната. 36.Барыкада. 37.Экзотыка. 38.Спадумен. 39.Селекцыя. 40.Арашэнне. 41."Гарызонт". 42.Мікрафон. 43.Дзяленне. 44.Стараста. 45.Акардэон. 46.Нясцерка. 47.Адсорбер. 48.Калектар. 49.Вопратка.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 nv@promedia.by
http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya

ISSN 2071-9647

9 772071 964000 13018

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 4.03.2013 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 27410 экз. Заказ №1026.